НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

СВЯТА КЛАСІЧНАЙ МУЗЫКІ TYZENHOUSE

Зоркі класічнай музыкі выступяць 12-15 верасня з канцэртамі ў Гродне на сцэне абласнога драматычнага тэатра. Прагучаць творы Моцарта, Шапэна, Брамса, Крэйслера, Пракоф'ева, Мусаргскага, Мендэльсона, Гайдна, Расіні, Шыманоўскага.

Ініцыятарам і галоўным арганізатарам свята класічнай музыкі TyzenHouse з'яўляецца ўраджэнец горада над Нёманам — вядомы піяніст Кірыл Кедук, пераможца многіх міжнародных конкурсаў, які выступае ў лепшых канцэртных залах Нью-Ёрка, Мілана, Токіа, саліруе ў вядомых аркестрах Расіі, Беларусі, Францыі, Італіі, Англіі. Па запрашэнні Кірыла ў Гродна прыедуць выдатныя музыканты, яго выкладчыкі з замежжа.

Свята распачнецца 12 верасня канцэртам піяніста-віртуоза, выкладчыка музычнай акадэміі горада Імала (Італія) Барыса Петрушанскага. 13 верасня выступяць Кірыл Кедук і вядомы скрыпач Міхаіл Сіманян. 14 верасня — канцэрт выдатнага інтэрпрэтатара твораў Шапэна, выкладчыка Варшаўскага музычнага ўніверсітэта Пятра Палечнага. 15 верасня Кірыл Кедук і яшчэ адзін наш зямляк, ураджэнец Дзятлава віяланчэліст Іван Карызна (лаўрэат міжнароднага конкурсу імя Пятра Чайкоўскага, цяпер вучыцца ў Парыжскай кансерваторыі), выступяць з Дзяржаўным камерным аркестрам Беларусі. Дырыжыраваць будзе Якуб Храновіч (Польшча).

Дарэчы, назвай свята ўшаноўваецца асоба гарадзенскага старасты Антонія Тызенгаўза, які не толькі будаваў мануфактуры, але і адкрыў першы ў горадзе тэатр, мастацкую школу, музычную капэлу.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ДВА ЗА АДЗІН

Дзень у верасні можна прысвяціць наведванню музеяў.

Як зручна, калі музеі знаходзяцца побач, як, напрыклад, Нацыянальны мастацкі і Нацыянальны гістарычны! Гэта зручна і самім музеям: яны дамовіліся аб сумеснай акцыі ў верасні, калі, набыўшы квіток у адзін музей, у другі можна трапіць за палову кошту. І ўсё за адзін дзень: музеі знаходзяцца побач, што зручна гледачам.

Акцыя будзе дзейнічаць з 14 верасня і да канца месяца. Гэта выдатная магчымасць пазнаёміцца адначасова з гісторыяй краіны і з гісторыяй мастацтва. Такі музейны падарунак да Дня горада ацэняць як жыхары сталіцы, так і госці. Можа, нават захочуць прыехаць на экскурсію ў Мінск, каб сумясціць прыемнае з карысным: і з сучасным горадам пазнаёміцца, і паглыбіцца ў яго гісторыю, і з прыемнасцю паглядзець на творы мастацтва як айчыннага, так і сусветнага. Музеі ж знаходзяцца ў адным квартале!

Ларыса ЦІМОШЫК.

ПАДЗЯЛІЦЕСЯ ВЕДАМІ ПРА ІНТЭРНЭТ

МАЛАДЫЯ ВАЛАНЦЁРЫ НАВУЧАЦЬ ПАЖЫЛЫХ ЛЮДЗЕЙ АКТЫЎНА КАРЫСТАЦЦА СУСВЕТНЫМ СЕЦІВАМ

1 кастрычніка ў сталіцы стартуе праграма «Сеціву ўсе ўзросты скараюцца». Такім чынам кампанія МТС, Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў і Фонд ААН у галіне народанасельніцтва ў межах праекта «Універсітэт трэцяга ўзросту» мае намер папулярызаваць сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі і карысныя анлайн-сэрвісы сярод людзей старэйшага ўзросту, дапамагчы ім у набыцці практычных навыкаў выкарыстання інтэрнэту.

Паводле слоў кіраўніка PR-групы СТАА «МТС» Таццяны Курбат, няўпэўненасць — асноўны фактар, які абмяжоўвае карыстанне інтэрнэтам людзьмі старэйшага ўзросту. А таму неабходна ствараць для іх курсы павышэння цікавасці да авалодання навыкамі ў галіне камп'ютарных тэхналогій.

Для рэалізацыі згаданай праграмы арганізатары шукаюць валанцёраў, гатовых раз на тыдні на працягу 4 месяцаў дзяліцца са сталымі людзьмі сваімі ведамі. Працаваць валанцёры будуць у парах, у тым тэрытарыяльным цэнтры, які ім геаграфічна бліжэй. Час таксама будзе дадаткова ўзгадняцца з усімі ахвотнымі. Перад пачаткам заняткаў кожны валанцёр пройдзе прафесійнае навучанне і атрымае спецыяльна распрацаваную праграму па рабоце з пажылымі людзьмі.

Дасласць заяўкі для ўдзелу ў праекце неабходна да 19 верасня на электронны адрас **we.volonteru@gmail.com.** Пазначайце, калі ласка, імя, імя па бацьку, прозвішча, нумар тэлефона, месца працы/вучобы, найбольш зручны час і дні для выкладання.

Святлана БАРЫСЕНКА.

МТБАНК: 3G ПЛАНШЭТЫ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ

МТБанк і Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва падпісалі пагадненне аб доўгатэрміновых партнёрскіх стасунках. Першым крокам стала перадача студэнтам ультрасучасных 3G планшэтаў.

— Інстытут падтрымлівае ідэю парламентарызму, раздзяленне ўлад, сацыяльнага партнёрства і лідарства, — адзначыў падчас урачыстай сустрэчы **старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў, ганаровы рэктар Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва Уладзімір КАРАГІН.** — Мы бачым канкрэтны прыклад сацыяльнай адказнасці бізнесу. Буйны прыватны банк зрабіў добрую справу ў дачыненні да прагрэсіўнай вучэбнай установы.

Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва рыхтуе спецыялістаў у галіне эканомікі і кіравання, паліталогіі і журналістыкі. За 20 гадоў працы вучэбная ўстанова стварыла сучасную мадэль рэалізацыі прафесійных і творчых здольнасцяў студэнтаў.

Паводле слоў **старшыні праўлення ЗАТ «МТБанк» Андрэя ЖЫШКЕВІЧА,** партнёрства паміж буйнымі камерцыйнымі структурамі і ўніверсітэтамі — распаўсюджаная сусветная практыка. Яно можа ажыццяўляцца ў межах сумесных праграм, дзе ВНУ будзе адказваць за стварэнне праектаў банкаўскіх прадуктаў, «запускаць» якія пазней будзе банк. Студэнты могуць вывучаць асаблівасці вядзення бізнесу ў нашай краіне на прыкладзе рэальных кейсаў кампаній. Наогул, МТБанк стабільна падтрымлівае студэнцкія ініцыятывы, праводзіць майстар-класы для навучэнцаў, супрацоўнічае таксама з БДУ, БДЭУ, Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце.

Святлана БАРЫСЕНКА.

АДУКАЦЫЙНЫ ЎЗРОВЕНЬ НАСЕЛЬНІЦТВА РАСЦЕ

Адукацыйны ўзровень насельніцтва Беларусі з кожным годам расце. Аб гэтым сведчаць даныя Нацыянальнага статыстычнага камітэта, паведамляе БЕЛТА.

Беларуская моладзь імкнецца атрымаць больш высокі ўзровень адукацыі. Сярод краін СНД, паводле даных на 2012 год, Беларусь уступала толькі Расіі па колькасці тых, хто атрымлівае сярэднюю спецыяльную, вышэйшую і паслявузаўскую адукацыю, — 621 чалавек на 10 тыс. насельніцтва. У той жа час па гэтым паказчыку Беларусь апярэджвала такія развітыя дзяржавы, як Швецыя (497 чалавек), Нарвегія (466 чалавек), Аўстрыя (434 чалавекі), Францыя (362 чалавекі), Італія (330 чалавек).

Па выніках шматіндыкатарнага кластарнага абследавання па ацэнцы становішча дзяцей і жанчын, праведзенага Нацыянальным статыстычным камітэтам у 2012 годзе, у Беларусі ўзровень адукаванасці падлеткаў і маладых людзей ва ўзросце 15-24 гадоў склаў 100 працэнтаў. Прычым якіх-небудзь адрозненняў у залежнасці ад месца пражывання, рэгіёна, узроўню дабрабыту і іншых прыкмет не выяўлена.

На момант правядзення перапісу насельніцтва 2009 года ў краіне пражывала 30 тыс. неадукаваных ва ўзросце 15 гадоў і старэйшых, або 0,4 працэнта агульнай колькасці насельніцтва гэтага ўзросту. Гэта ў асноўным асобы, якія не мелі магчымасці наведваць школу з-за цяжкіх фізічных і разумовых недахопаў.

Даныя перапісу даюць магчымасць фактычна лічыць Беларусь рэспублікай суцэльнай адукаванасці насельніцтва.

Такія вынікі дасягнуты дзякуючы палітыцы дзяржавы, накіраванай на развіццё сістэмы адукацыі, павышэнне яе якасці і даступнасці. Расходы дзяржавы на гэту сферу ў 2012 годзе склалі Br27,2 трлн, або 17,5 працэнта расходаў кансалідаванага бюджэту. Для параўнання: у 2005 годзе на адукацыю было зрасходавана 13,3 працэнта бюджэту. Доля расходаў на адукацыю ў валавым унутраным прадукце склала 5,1 працэнта.

Статыстычны агляд падрыхтаваны да Міжнароднага дня пісьменнасці, які адзначаецца 8 верасня. Пісьменнасць адносіцца да асноўных правоў чалавека, замацаваных ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, аснова ўсіх форм адукацыі і навучання на працягу ўсяго жыцця, а таксама інструмент развіцця індывідуальнага чалавечага патэнцыялу і грамадства ў цэлым.

■ З нагоды

ТУТ ЁН РАСКРЫЎ КРЫЛЫ...

11 верасня спаўняецца 75 гадоў з часу адкрыцця Дома-музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку — першай музейнай установы ў Беларусі, прысвечанай канкрэтнай асобе. З гэтай нагоды на пытанні «Звязды» адказвае дырэктар музея, аўтар шматлікіх кніг і артыкулаў пра гісторыю Навагрудчыны і яе славутых ураджэнцаў Мікалай ГАЙБА.

Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку.

Фота Міхаіла ГАЙБЫ.

— І сёння ў даследаваннях пра Міцкевіча падаюцца два варыянты мясцін, дзе Адам нарадзіўся: горад Навагрудак і фальварак Завоссе. Якое ж месца ў гэтай «спрэчцы» займае дом-музей?

— Дом быў пабудаваны бацькам Адама Міцкевіча ў 1806-1807 гадах. У ім сям'я Міцкевічаў жыла да 1812 года — да смерці бацькі паэта. Пасля сям'я пакідае гэты дом, бо не было сродкаў яго ўтрымліваць, і пераходзіць жыць у флігель, які стаяў на пляцы. Пасля смерці маці 9 кастрычніка 1820 г. дом атрымалі ў спадчыну чатыры браты: Францішак, Адам, Аляксандр і Ежы Міцкевічы. Гаспадаром стаў Францішак, браты ж раз'ехаліся: Аляксандр меў юрыдычную практыку ў Кіеве, Ежы, медык, знаходзіўся на Валыні, Адам быў высланы ў Расію. Францішак жыў у Навагрудку да выбуху паўстання 1830 года. Ён удзельнічаў у паўстанні, за што ў 1833 годзе яго маёмасць, у тым ліку і дом, была канфіскавана і затым прададзена. Шмат разоў дом пераходзіў з рук у рукі. Новыя гаспадары ставілі ўласную мэблю, посуд...

У 1863 г. згарэў драўляны флігель, а ў 1881 г. агонь знішчыў сам дом. Праз некалькі гадоў яго адбудавалі. Знешні выгляд будынка быў зменены. У верасні 1938 г. тут адкрылі музей.

— Як ён ствараўся?

— Навагрудчане і раней спрабавалі ўвекавечыць памяць аб сваім славутым земляку. Навагрудскі павятовы рэўкам 16 верасня 1920 г. выдаў загад аб утварэнні ў доме, дзе жыў Адам Міцкевіч, музея або бібліятэкі яго імя. Аднак працягвалася польска-савецкая вайна, і ўжо праз два тыдні ў горад увайшлі польскія войскі.

Рэальна дом-музей быў створаны ў 1930-я гады намаганнямі «Міцкевічаўскага камітэта» — добраахвотнага навуковага таварыства пад кіраўніцтвам мясцовага ваяводы. 28 чэрвеня 1931 г. на былым доме Міцкевічаў была ўсталявана мемарыяльная дошка з надпісам (на польскай мове): «Тут на заранку жыцця раскрыў крылы для паэтычнага ўзлёту Адам Міцкевіч». Праз 5 гадоў у флігелі размясцілі невялікую часовую экспазіцыю будучага музея. Адкрылі яго 11 верасня 1938 года, першым дырэктарам стаў Уладзіслаў Ляруй.

З усталяваннем у Заходняй Беларусі савецкай улады пастановай Савета Народных Камісараў БССР ад 3 снежня 1940 г. дом-музей быў узяты пад ахову дзяржавы і перайшоў у распараджэнне Народнага камісарыята асветы. Бюджэтам на 1941 г. выдаткоўваліся неабходныя сродкі на рамонт, абсталяванне і афармленне дома-музея і флігеля, прадугледжвалася стварэнне бібліятэкі.

У даваенным музеі знаходзіліся памяткі пра Марылю Верашчака: старасвецкі куфар, абкаваны масіўнымі абручамі, люстэрка, шаль і крыж, які вісеў у яе спальні, розныя фотаздымкі. У музеі былі судовыя акты бацькі і дзеда, напісаныя гусіным пяром, лісты Адама да сяброў і Марылі, некалькі кніжак з хатняй бібліятэкі ў Парыжы. Але гэтыя і іншыя экспанаты не захаваліся: у чэрвені 1941 г. дом-музей быў разбураны нямецкай авіябомбай.

— І што ўяўляе цяпер музейная калекцыя? Якія экспанаты лічыцце найбольш каштоўнымі?

— У пасляваенныя гады да 100-годдзя з дня смерці паэта дом-музей адбудавалі ў даваенным выглядзе. Рашэнне аб аднаўленні музея было прынята Навагрудскім Саветам дэпутатаў працоўных у 1948 г. Экспазіцыя грунтавалася на матэрыялах, дасланых з музея Адама Міцкевіча ў Варшаве, а таксама з іншых устаноў Беларусі, Польшчы, Літвы, Расіі, Украіны.

Урачыстае адкрыццё адбудаванага дома-музея адбылося 26 лістапада 1955 года. А новая, цяперашняя экспазіцыя ў пяці пакоях галоўнага будынка адкрылася 25 мая 2001 г. — з удзелам прапрапраўнука паэта Рамана Гарэцкага-Міцкевіча. Першыя тры залы (дзіцячы і гасцінны пакоі, кабінет бацькі) нагадваюць інтэр'ерам дом сям'і Міцкевічаў. Можна ўбачыць гадзіннік, які стаяў у віленскім пакоі Адама Міцкевіча ў 1822 г., акуляры, падараваныя яму рускімі сябрамі, камінную заслонку з былога палаца Храптовічаў у Шчорсах, столікі і крэслы з Туганавіч, дзе жыла Марыля Верашчака. Сярод іншых рэчаў, звязаных з Міцкевічам і яго акружэннем, — прадметы мэблі і

У музеі былі судовыя акты бацькі і дзеда, напісаныя гусіным пяром, лісты Адама да сяброў і Марылі, некалькі кніжак з хатняй бібліятэкі ў Парыжы. Але гэтыя і іншыя экспанаты не захаваліся.

сталовага посуду, раяль, веер, гадзіннікі першай паловы XIX ст., матэрыялы з раскопак на радзіме паэта ў Завоссі, яго кнігі, рукапісы, партрэты сяброў і знаёмых. Паказваем таксама бронзавую мадэль помніка Адаму Міцкевічу ў Парыжы (адзіны экспанат, які захаваўся з даваеннага музея), гранітную пліту з бюстам паэта (Варшава, 1900), заказаную яго старэйшай дачкой Марыяй.

Сёння ў музейных фондах знаходзіцца 9 прыжыццёвых выданняў твораў Міцкевіча, 120 старадрукаваных кніг, рукапісы твораў беларускіх і замежных паэтаў, пісьменнікаў, калекцыя жывапісу і графікі, фота- і фонадакументаў. Маем пераклады твораў Міцкевіча на розныя мовы свету. Нядаўна гэтая калекцыя папоўнілася паэмай «Пан Тадэвуш» у перакладзе на кашубскую і на азербайджанскую мовы, а таксама зборнікам твораў Ю.Славацкага, выдадзеным у 1930-х гадах, сучаснымі манаграфіямі польскіх даследчыкаў паэм «Пан Тадэвуш» і «Дзяды».

— Наколькі запатрабаваны музей наведнікамі?

— Штогод мы сустракаем да 20 тысяч чалавек, праводзім звыш 500 экскурсій на беларускай, рускай, польскай і англійскай мовах. Ладзім літаратурна-музычныя вечарыны, навуковыя канферэнцыі, выставы, батлеечныя спектаклі.

Летась у Маскве выдадзены ў супрацоўніцтве з нашым музеем часопіс «Усадьба Мицкевичей в Новогрудке» (32 старонкі фармату А4, тыраж 100 тысяч экзэмпляраў), дзе змешчана каля 30 каляровых фотаздымкаў. Часопіс распаўсюджваецца ў краінах СНД, неўзабаве гэты выпуск можна будзе набыць у кіёсках «Белсаюздруку».

— Відаць, што 75-гадовы юбіляр не цураецца новых музейных тэхналогій ...

— Так, мы маем свой сайт у інтэрнэце, старонкі музея створаны ў сацыяльных сетках. З мінулага года на нашым сайце прапануем наведнікам здзейсніць віртуальнае падарожжа па музеі — 3D-панарамы. Для іх зручнасці мы хацелі б мець і мультымедыйнае абсталяванне, каб кожны змог паглядзець фільмы пра Адама Міцкевіча, паслухаць песні на яго вершы (яны ёсць у нашых фондах), пашырыць інтэрактыўны доступ да нашых музейных прадметаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

■ Зала славы

ПАКОЙ КАСМАНАЎТЫКІ... У ЧЭРВЕНЬСКАЙ ШКОЛЕ

Пра гэтую падзею размова ішла ўжо даўно. І вось нарэшце — адбылося! У СШ № 2 Чэрвеня адкрыўся музейны пакой касманаўтыкі! Менавіта гэтую школу ў 1988 годзе скончыў трэці беларускі касманаўт Алег Навіцкі.
Ён знайшоў час, каб чарговы раз завітаць у родны горад, родную школу. Ды яшчэ — з такой незвычайнай нагоды.

Пачалося свята на школьным двары з гучных апладысментаў, якімі прысутныя шчыра прывіталі нашага земляка, лётчыка-касманаўта Раскосмасу Алега Навіцкага і яго маці, Валянціну Эдуардаўну. Як заўсёды, школьнікі і педагогі падрыхтавалі для гасцей адмысловы сцэнар. Словы — узнёслыя і цёплыя, урачыстыя і сардэчныя. Вершы і прозу. І вось ужо вядучыя, дзевяцікласнікі Карына Высоцкая і Дзмітрый Колтун, даюць слова Алегу Навіцкаму. Той са смехам заўважае: «А нам такога не задавалі!»

Цікава было пачуць, што эмблему экіпажа распрацоўваў менавіта Алег — як яго камандзір. Пад прозвішчамі ўдзельнікаў размешчаны зоркі са шлейфамі, якія скіроўваюцца да МКС, і колеры тых мясцін, дзе нарадзіўся кожны член экіпажа.

Алег відавочна хвалюецца, калі пераразае чырвоную стужку на ўваходзе. Бо ўпершыню такое дзейства — у родным горадзе, роднай школе. Ён крочыць у музейны пакой, а ўслед за ім — і прысутныя.

Цэнтральны стэнд музейнай экспазіцыі атрымаў назву «На шляху да мары». Так, ён — у гонар нашага земляка Алега Навіцкага і яго экіпажа. А калі глядзець на стэнды ў храналагічным парадку, дык першы з іх, натуральна, і прысвечаны першым. Першаму касманаўту Юрыю Гагарыну, першай жанчыне-касманаўту Валянціне Церашковай. А трэці стэнд — гэта беларусы ў космасе. Так, для нас гэта — асобная гісторыя. І тут наш Алег роўны з роўнымі — з Пятром Клімуком і Уладзімірам Кавалёнкам.

Літаральна напярэдадні адкрыцця музейнага пакоя касманаўтыкі Алег перадаў сюды шмат экспанатаў. Узоры касмічнага харчавання, што захапілі сваёй незвычайнасцю як дзяцей, так і дарослых. Фрагменты экіпіроўкі касманаўта, якія пабылі ў космасе. Асабістыя рэчы Алега. Цікавая дакументацыя. Два касцюмы, шлемафон з мікрафонамі, пілотка... Не скафандр, вядома. Затое палётны касцюм таксама пабываў у космасе!

Цікава, што па прапанове намесніка старшыні Чэрвеньскага райвыканкама па сацыяльнай сферы і ідэалагічнай рабоце Алы Шахоцька першым экскурсаводам стаў менавіта ўладальнік рэчаў — наш касманаўт. І яго аповед-экспромт, як заўсёды, быў простым, даступным, зразумелым, і разам з тым — захапляльным.

Прызнаюся, я шмат чула ад Алега падчас нашых стасункаў пра многія рэчы. Але і для мяне прагучала гэтым разам шмат новага. Напрыклад, пра люстэрка, якое мацуецца да рукава скафандра. Аказваецца, без яго касманаўт — як без рук! Асабліва камандзір карабля, які ў палёце знаходзіцца ў крэсле ніжэй за бортінжынераў. І толькі з дапамогай люстэрка ён можа зазірнуць у ілюмінатар, праверыць стан сваіх калег, герметычнасць замкоў ды іншае.

Цікава было пачуць, што эмблему экіпажа распрацоўваў менавіта Алег — як яго камандзір. Пад прозвішчамі ўдзельнікаў размешчаны зоркі са шлейфамі, якія скіроўваюцца да МКС, і колеры тых мясцін, дзе нарадзіўся кожны член экіпажа. Сонечныя панелі МКС зроблены ў выглядзе рымскіх лічбаў, якія чытаюцца як «33». Гэта — сімвал 33-й экспедыцыі, да якой далучыўся экіпаж Алега Навіцкага. А затым яны распачалі і 34-ую.

Што ж датычыцца самага вялікага здымка (ля якога пазней прапаноўваю касманаўту сфатаграфавацца: «Чацвёртым будзеш?!»), дык зроблены ён за некалькі гадзін да вяртання экіпажа з МКС на Зямлю. Гэта, як патлумачыў Алег, клопат тых, хто застаецца на станцыі: дапамагчы апрануцца, сфатаграфаваць, правесці...

Наступны адмысловы экспанат — медыцынскі пояс, які знаходзіцца ў кожнага касманаўта пад скафандрам. Падчас актыўных дзеянняў ён рэгулярна перадае на Зямлю пэўныя паказчыкі — тэмпературу цела, пульс і г.д.

Апроч афармлення пакоя касманаўтыкі, у гаспадароў знайшлося яшчэ чым здзівіць госця. Яго ўжо сустракалі ў свой час хлебам-соллю, дарылі сувенірную прадукцыю, выробленую рукамі школьнікаў... Улетку прысвоілі званне «Ганаровы грамадзянін Чэрвеньшчыны». А гэтым разам начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму райвыканкама Ларыса Асановіч уручыла касманаўту... адмыслова распісаны гаршчочак мёду і мёд у сотах! Чарговы сімвал: Чэрвеньшчына здаўна славілася пчалярствам.

Цудоўна памятае гэта і Алег Навіцкі: адразу прыгадаў герб горада, дзе адлюстраваны працавітыя пчолкі. І ў працяг тэмы ўручыў дырэктару СШ №2 Тацяне Аляшкевіч сцяжок з тым самым гербам. Але не просты, а той, што злятаў з ім у космас! Адзначаны пячаткамі МКС — з датай стыкоўкі і расстыкоўкі іх экспедыцыі.Сапраўдны рарытэт, які трэба беражліва захоўваць!

Літаральна напярэдадні адкрыцця музейнага пакоя касманаўтыкі Алег перадаў сюды шмат экспанатаў. Узоры касмічнага харчавання, што захапілі сваёй незвычайнасцю як дзяцей, так і дарослых. Фрагменты экіпіроўкі касманаўта, якія пабылі ў космасе. Асабістыя рэчы.

...Касманаўту і яго маці, гасцям арганізатары свята прапаноўваюць паўдзельнічаць у пасадцы туй, якія стануць пачаткам алеі Касманаўтаў. Мабыць, Алег адразу ж прыгадаў Байканур, дзе пасадка дрэў — адна з перадпалётных традыцый.

І тут, на тэрыторыі роднай школы, ён стаў першым у гэтай справе. Першы саджанец, што найбліжэй размешчаны да пакоя касманаўтыкі, — яго. Як і першы водгук у музейнай «Кнізе запісаў».

Удзячныя школьнікі ўручылі кветкі касманаўту і самаму галоўнаму чалавеку ў яго жыцці — маме, Валянціне Эдуардаўне, чым расчулілі яе да слёз. Зноў матуліны хваляванні, але на гэты раз — прыемныя...

Святлана АДАМОВІЧ.
Фота аўтара

■

ВОГНЕННЫЯ ВЁСКІ

КУРГАН ПАМЯЦІ

У вёсцы Дубінка Магілёўскага раёна 70 гадоў таму фашысты спалілі паселішча і яе жыхароў — старых, жанчын і дзяцей.

У Магілёўскім раёне акупанты спалілі 7 вёсак, 3 тысячы чалавек былі закатаваны і расстраляны, больш за 1,5 тысячы мясцовых жыхароў вывезены ў Германію.

Аляксандра Пятроўская і Міхаіл Клепікаў у 1943 годзе былі дзецьмі, але памятаюць многае. Яны ўзгадваюць, як раніцай прыйшоў немец з перакладчыкам і стаў выклікаць па спісе сем'і, дзе былі партызаны. Малыя ўцяклі ў лес і праз кусты назіралі за вялікім пажарам і не адразу зразумелі, куды падзеліся людзі. Потым ацалелыя людзі ратаваліся ў зямлянках партызанскага атрада.

Вёска Дубінка на пачатку 1943 года знаходзілася пад абаронай 121-га партызанскага палка Асмана Касаева. Такіх вёсак пад кантролем партызанаў, ад ракі Друць у Бялыніцкім раёне да Дняпра ў Магілёўскім, было шмат. І ў лютым 1943 года фашысты распачалі актыўныя баі супраць партызанаў. Жыхароў Дубінкі жорстка пакаралі за сувязь з імі. Вось як пра гэта ўзгадвае былы камісар 121-га партызанскага палка Іван Іваноў, успаміны якога захоўваюцца ў фондах Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея.

«У вёсцы Дубінка фашысты сагналі ў адно гумно 23-х старых ад 65 і вышэй гадоў, 42-х жанчын і 27 дзяцей да 12 гадоў, аблілі гумно гаручай вадкасцю і ўсіх людзей папалілі», — узгадваў ветэран.

Успаміны Івана Мартынавіча напісаны даўно, і іх вызначае ўзнёслы старасавецкі стыль, аднак расповед сведкі дае ўяўленне пра падзеі 70-гадовай даўніны.

«Учыненае немцамі ліхадзейства над мірным насельніцтвам, старымі, жанчынамі і дзецьмі толькі павышалі народны патрыятызм і яшчэ больш распальвалі ўсенародную партызанскую барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Партызаны і партызанкі нашага палка, чые бацькі, жонкі і дзеці былі спалены зажыва ў гумне Дубінкі, над грудай спаленых трупаў на другі дзень пасля злачынства ў прысутнасці ўсіх партызанаў з болем у сэрцах пакляліся адпомсціць катам.

13-гадовы партызан Мікалай Філімонаў, маці і два малодшыя браты якога былі спалены, стаяў побач са сваім бацькам, камісарам 1-га батальёна Сямёнам Філімонавым, над абгарэлымі целамі і выціраў слёзы шапкай-вушанкай з чырвонай стужкай. Ён сказаў: «Тата, дай мне аўтамат, я будуць біць фашыстаў да апошняй сваёй юнацкай кроплі крыві». Камісар батальёна Філімонаў павесіў на шыю сыну свой аўтамат, а ў гэты ж час камандзір палка Асман Касаеў уручыў Філімонаву аўтамат і дзве гранаты.

Затым выступіў партызан Пухоўскі, жонка і дзеці якога таксама былі спалены фашыстамі. А на заканчэнне слова мовіў камандзір палка Асман Касаеў. Пасля гэтага на працягу некалькіх хвілін усе моўчкі стаялі. Потым абгарэлыя трупы былі складзены ў адну вялізную скрыню, якую апусцілі ў яміну і закапалі.

Тут жа ўсім падраздзяленням палка былі дадзены баявыя заданні. У адказ на злачынствы фашыстаў у вёсцы Дубінка каля станцыі Буйнічы ў Магілёве выбухнуў чыгуначны састаў праціўніка, і ў гэтай аперацыі браў удзел 13-гадовы партызан Мікалай Філімонаў са сваім бацькам. Таксама было пашкоджана 10 кіламетраў шашэйнай дарогі «Магілёў — Мінск» у раёне Нежкава, Княжыцаў і Пашкава, разгромлены нямецкі гарнізон у сяле Гуслішча Магілёўскага раёна».

Цяпер у вёсцы Дубінка пра трагедыю 1943 года нагадвае курган памяці, дзе сабрана зямля з усіх спаленых з людзьмі вёсак Магілёўскага раёна. Уверсе — выява маці з дзіцем, як сімвал міру і святла, да якіх імкнуцца ўсе людзі на зямлі.

Ілона ІВАНОВА